**Алесь Пашкевіч**
(Мінск)

# Удзел беларускіх нацыянальных арганізацыяў у парламенцкіх выбарах у Польшчы ў 1930 г.

30 жніўня 1930 г. дэкрэтам прэзідэнта Польшчы быў датэрмінова распушчаны парламент, які працаваў з сакавіка 1928 г. Адразу пасля гэтага быў выдадзены загад аб арышце ўсіх камуністычных паслоў. Сярод арыштаваных аказаліся 3 паслы блізкага да камуністаў Беларускага сялянска-рабочага пасольскага клуба (БСРПК) Язэп Гаўрылік, Флягонт Валынец і Павел Крынчык (пасол гэтага самага клуба, Ігнат Дварчанін, быў арыштаваны яшчэ раней). 10 верасня былі арыштаваныя таксама шэраг былых паслоў, „якія дапусцілі злачынствы як крымінальнага (крадзежы, ашуканствы, прысвойванні і г.д.), так і палітычнага (стрэлы ў паліцыю, заклікі да беспарадкаў і непадпарадкавання ўладам, антыдзяржаўныя выступленні і г.д.) характару”. Арышты ахапілі ў першую чаргу лідэраў партый т.зв. Цэнтралева, аднак таксама і „тых былых паслоў, дзейнасць якіх стварала прычыны для ўмяшальніцтва права і толькі пасольская недатыкальнасць ахоўвала іх да гэтага перад адказнасцю”[1]. Сярод іншых быў арыштаваны беларускі сенатар Васіль Рагуля, які быў асуджаны судом яшчэ да выбару ў сенатары і вызвалены тады па патрабаванні верхняй палаты.

Такія рашучыя дзеянні ўладаў выразна сведчылі, што на дэмакратычныя выбары спадзявацца не варта і кіраўніцтва дзяржавы прыкладзе ўсе намаганні, каб у новы парламент, выбары ў які былі прызначаны на 16 і 23 лістапада 1930 г. адпаведна ў Сейм і Сенат, прайшло як мага менш апазіцыйных кандыдатаў. Тым не менш, адразу пасля роспуску парламента пачалася падрыхтоўка беларусаў да новых выбараў. Віленскі Беларускі нацыянальны камітэт (БНК) заклі-

[1] A. Ajnenkiel, *Historia Sejmu Polskiego*, t. II, cz. II, *II Rzeczpospolita*, Warszawa 1989, s. 155.

каў усе беларускія нацыянальныя арганізацыі і ўвесь беларускі народ, каб не разбіваць сваіх сілаў, а злучаць іх і ісці на выбары адзіным супольным беларускім фронтам. З гэтай мэтай БНК на агульным сходзе 9 верасня 1930 г. арганізаваў часовую агульнабеларускую выбарчую камісію, якой даручыў склікаць з’езд беларускіх нацыянальных арганізацыяў і паасобных беларускіх нацыянальных дзеячаў дзеля стварэння адзінага Беларускага выбарчага камітэта[2].

Да часу выбараў у беларускім нацыянальным руху існавалі 3 асноўныя плыні:

1) Прыхільнікі камуністаў, якія гуртаваліся ў 1928-1930 гг. вакол Беларускага сялянска-рабочага пасольскага клуба, 4 з 5-ці сябраў якога пасля роспуску парламента былі арыштаваныя, а адзін (Іван Грэцкі) пазбег такога самага лёсу толькі дзякуючы своечасовай эміграцыі.

2) Беларуская хрысціянская дэмакратыя (БХД), Беларускі сялянскі саюз (БСС) і Беларускае праваслаўнае дэмакратычнае аб’яднанне (БПДА). Гэтыя тры партыі трымаліся незалежніцкай арыентацыі і традыцыйна ва ўсіх палітычных акцыях выступалі супольна. Дадзеная выбарчая кампанія не стала выключэннем. Праўда, апошнія дзве партыі да часу выбараў мелі зусім нязначны ўплыў, існуючы практычна толькі на паперы. Прадстаўнікі гэтага накірунку беларускага нацыянальнага руху стварылі Агульнабеларускі выбарчы камітэт (АБВК), пастулюючы, што „палітычным ідэалам кожнага народу ёсць яго поўная палітычная і культурная незалежнасць, а святым палітычным правам павінна быць права свабоднага самастанаўлення аб сваёй палітычнай і нацыянальнай долі”, аднак „у сучасны момант, як народ складаючы частку насялення Польскай Рэспублікі, Беларускі Народ, жывучы ў Польскай Дзяржаве, павінны карыстацца тою поўнаю свабодаю і роўнасцю з другімі насяляючымі Польшчу народнасцямі, якія ўстаноўлівае Канстытуцыя Польскай Рэспублікі”. Для гарантавання гэтага патрабавалася „выдзяленне беларускіх часцін з польскіх адміністрацыйных вокругаў, куды яны далучаны з асобнымі палітычнымі мэтамі”. Акрамя таго, праграма камітэта прадугледжвала змаганне за зямлю, абарону лясоў і прыродных багаццяў, змаганне за правы і інтарэсы рабочых, змаганне за змяншэнне падаткаў і палепшанне эканамічнага жыцця, абарону роднай школы, абарону поўнай свабоды ўсіх рэлігій і інш.[3]

[2] *Białorusini*, „Warszawska Informacja Prasowa. Wszystkie Stronnictwa”, 1930, nr 38 (167), 29 września, s. 358.

[3] *Плятформа Агульнага Беларускага Выбарнага Камітэту „Украінска-Беларускага Блёку”*, „Беларускі кліч”, 1930, № 1, 1 лістапада, с. 2-3.

3) Створаны непасрэдна перад выбарамі Цэнтральны саюз беларускіх культурна-асветных арганізацыяў і інстытуцыяў („Цэнтрасаюз”). Сярод яго сябраў было шмат вельмі вядомых у беларускім нацыянальным руху дзеячаў — Антон Луцкевіч, Радаслаў Астроўскі, Янка Станкевіч і інш. Палітычным крэда гэтай групоўкі стала „мабілізацыя ўсіх беларускіх груп радыкальнага характару на грунт пазітыўнай культурна-асветнай працы”. Пры гэтым арганізацыя адмаўлялася ад абвінаваўчых лозунгаў, накіраваных супраць польскай дзяржавы[4]. Змаганне за правы беларускага насельніцтва прадугледжвалася толькі метадамі і спосабамі, згоднымі з існуючымі законамі Польшчы. Было вырашана дабівацца заканадаўчага акту аб шырокай аўтаноміі на Беларускіх землях з краёвымі заканадаўчай, выканаўчай і судовай уладамі[5]. У цэлым жа выбарчая праграма „Цэнтрасаюза” адрознівалася ад праграмы АБВК практычна толькі фармулёўкамі.

Як і падчас двух папярэдніх выбараў, у 1930 г. выказваліся ідэі аб заключэнні Блока нацыянальных меншасцяў Польшчы. Аднак сур'ёзных крокаў для іх рэалізацыі ніхто не прадпрымаў. Прадстаўнікі габрэйскай грамадскасці называлі Блок нацыянальных меншасцяў узору 1928 г. карыкатурай, адкідаючы пры новых умовах усялякую магчымасць выбарчага супрацоўніцтва, у першую чаргу з украінцамі. Як супрацьблокавыя аргументы яны прыводзілі якраз у гэты час распачатую галіцыйскімі ўкраінцамі акцыю непадпарадкавання, а таксама пашыранасць сярод украінцаў антысеміцкіх настрояў. У выніку нават архітэктар папярэдніх двух блокаў, адзін з лідэраў польскіх сіяністаў Іцхак Грынбаўм прызнаў гэтым разам падобнае аб'яднанне за неадпаведнае нацыянальным інтарэсам[6].

У беларусаў адносіны з габрэямі ў той час таксама былі не найлепшыя. Іх пагаршэнню паспрыяла сярод іншага ўстрыманне габрэйскага насельніцтва ад галасавання падчас перавыбараў у Свянцянскай акрузе ў чэрвені 1930 г., у выніку чаго беларусы страцілі 2 пасольскія мандаты. Пра гэта казаў Фабіян Ярэміч у адным са сваіх інтэрв'ю, адзначаючы адначасова, што „беларусаў з укра-

[4] E. Wappa, *Okoliczności powstania Centralnego Związku Białoruskich Organizacji i Instytucji Kulturalno-Oświatowych („Centrasajuzu”) i jego udział w wyborach 1930 roku*, „Białoruskie Zeszyty Historyczne”, 1994, z. 1, s. 66.

[5] *Наказ Галоўнай Рады Цэнтральнага Саюзу Беларускіх Культурна-Асьветных і Гаспадарскіх Арганізацыяў і Інстытуцыяў кандыдатам на пасłоў у Сойм і Сэнат, прыняты і зацьверджаны на I Сэсіі Галоўнай Рады — 27 верасьня 1930 г. у зьвязку з выбарамі*, Вільня 1930, с. 8.

[6] *Żydzi. Wybory do Sejmu i Senatu*, „Sprawy Narodowościowe”, 1930, nr 5-6, s. 626.

інцамі, якіх адвеку звязаў агульны лёс, і сёння аб'ядноўваюць найлепшыя стасункі"[7]. Таму падчас разглядаемых выбараў беларускія хадэкі і сельсаюзнікі прыйшлі да згоды з найбуйнейшымі ўкраінскімі арганізацыямі і заснавалі „Украінска-беларускі выбарчы блок" (УБВБ), дзяржаўны спіс якога атрымаў № 11. Стварэнне падобнага аб'яднання адпавядала праграмным лініям абедзвюх партый[8]. Так, на думку аднаго з лідэраў БХД кс. Адама Станкевіча, Беларусь знаходзілася на скрыжаванні дзвюх розных культур (заходняй і ўсходняй), прадстаўнікі кожнай з якіх імкнуцца да асіміляцыі беларусаў. Каб захаваць у такіх умовах сваю нацыянальную адметнасць, беларусы мусяць аказваць супраціў чужым уплывам, шукаючы пры гэтым паразумення з украінцамі і літоўцамі як з натуральнымі саюзнікамі, якія таксама знаходзяцца ў падобнай сітуацыі[9].

Паразуменне з украінцамі прадугледжвала, што беларусы павінны былі праводзіць выбарчую кампанію ў Бельскай, Беластоцкай, Гродзенскай, Брэсцкай, Наваградскай, Лідскай, Віленскай і Свянцянскай акругах. Аднак недахоп сродкаў вельмі абмежаваў магчымасці беларусаў, таму выбарчая акцыя Агульнабеларускага выбарчага камітэта практычна абмежавалася Наваградчынай, Лідчынай, Віленшчынай і Свянцяншчынай. Да таго ж і так невялікія магчымасці БХД і БСС аказаліся яшчэ больш абмежаваныя расколам, які адбыўся ў іх шэрагах непасрэдна перад выбарамі. Ініцыятарамі расколу сталі былыя беларускія паслы хадэк Альбін Стаповіч і сельсаюзнік Кастусь Юхневіч, якім гэтым разам не знайшлося месца на спісе УБВБ. Згаданыя дзеячы стварылі асобную арганізацыю Беларускіх незалежных радыкалаў і выступілі з уласным спісам у Свянцянскай акрузе. Гэтым дзеячам удалося перацягнуць на свой бок групу моладзі з БХД, а таксама, дзякуючы радыкалізму праграмы — частку былых „змаганцаў". Абодва паслы праявілі вялікую асабістую энергію падчас выбарчай кампаніі, што, аднак, не прынесла ім вялікага поспеху. Дзейнасць „незалежных радыкалаў" прывяла толькі да яшчэ большага расцярушвання беларускіх галасоў у Свянцянскай акрузе[10].

Геаграфічна абмежаванай тэрыторыямі Віленскага і Наваградскага ваяводства аказалася і выбарчая кампанія „Цэнтрасаюза". Арганізацыя аказалася здольная да выстаўлення ўласных спісаў

7 Centralne Archiwum Wojskowe (далей: CAW), Oddział II Sztabu Generalnego, sygn. I.303.4.2479, k. 61.

8 E. Wappa, *Okoliczności powstania Centralnego Związku...*, s. 69.

9 A. Stankievič, *Biełaruski chryścijanski ruch*, Vilnia 1939, s. 238-239.

10 CAW, Oddział II Sztabu Generalnego, sygn. I.303.4.2706, k. 22-23.

толькі ў тых самых акругах, што і УБВБ.

У Палескім і Беластоцкім ваяводствах беларускія нацыянальныя дзеячы на гэты раз практычна дзейнасці не праводзілі. Толькі камуністы зрабілі спробы выставіць спісы ва ўсіх акругах. Астатнім беларускім арганізацыям папросту не хапала на гэта сілаў. Украінска-беларускі блок, праўда, зрабіў спробу выставіць сеймавы спіс у Беластоцкай выбарчай акрузе, аднак ён быўануляваны, а кандыдаты арыштаваныя[11]. У тым жа Беластоку была выдадзена беларуская аднаднёўка „Адозва!" пад рэдакцыяй Кастуся Сідаровіча. Выйшла дадзенае выданне ад імя Беларускага апалітычнага калегіума працаўнікоў культурна-асветных арганізацыяў у Беластоку і заклікала да аддачы галасоў у выбарах за тых асоб, якія будуць змагацца за беларускія нацыянальныя інтарэсы. Аднак далей за выданне гэтай адозвы яе аўтары не пайшлі[12].

Факт невядзення перадвыбарчай працы ў Пінскай і Брэсцкай акругах лідэры „Цэнтрасаюза" імкнуліся выкарыстаць у барацьбе з БХД, абвінавачваючы кіраўнікоў апошняй у запраданні ўкраінцам карэнных беларускіх земляў Палесся ўзамен за абяцанне мандата з дзяржаўнага спісу[13].

Былыя прыхільнікі БСРПК, падобна як на выбарах 1928 г., трымаліся тактыкі адначасовага выстаўлення некалькіх выбарчых спісаў. Так, у Наваградскай выбарчай акрузе было прынята рашэнне аб выстаўленні трох сеймавых спісаў (Рабоча-сялянскага адзінства (непасрэдна Кампартыі), „Змагання" на чале са зняволенымі пасламі БСРПК і Пралетарска-сялянскага саюза на чале з мясцовымі блізкімі да камуністаў дзеячамі, легальна працуючымі ў ТБШ) і двух сенацкіх (Сялянска-рабочага адзінства і „Змагання")[14]. У сваёй перадвыбарчай кампаніі камуністы трымаліся крайне радыкальных пазіцыяў, не жадаючы ісці нават на тактычныя кампрамісы з польскай лявіцай і беларускімі нацыянальнымі арганізацыямі. Выбарчая агітацыя скіроўвала выбаршчыкаў на барацьбу з усімі некамуністычнымі арганізацыямі: „Час выступіць адзіным рэвалюцыйным фронтам працоўных мас усіх нацыянальнасцей пад кіраўніцтвам Кампартыі на няшчадную барацьбу супраць фашысцкай дыктатуры і яго агентаў — ППС, „Стронніцтва хлопскага", „Вызвалення" і беларус-

[11] *З Беларускага жыцьця. Пад Польшчай*, „Беларускі кліч", 1930, № 1, 1 лістапада, с. 3.

[12] J. Traczuk, *Prasa białoruska w II Rzeczypospolitej (1918-1939)*, „Studia polonoslavica-orientalia. Acta literaria", 1992, nr 13, s. 257.

[13] CAW, Oddział II Sztabu Generalnego, sygn. I.303.4.2706, k. 20.

[14] Archiwum Akt Nowych (далей: AAN), Nowogródzki Urząd Wojewódzki, sygn. 975/36, s. 20-21.

кіх нацыянал-фашыстаў”[15]. Камуністы нават і не хавалі, што ўдзельнічаюць у выбарчай кампаніі толькі з дэманстратыўнымі мэтамі, і практычныя вынікі ў выглядзе колькасці праведзеных прадстаўнікоў іх цікавяць мала: „Сейм — гэта прыманка для працоўных мас, каб уцягнуць іх у фашысцкую мышалоўку. (...) Трэба выкарыстаць выбарную кампанію, каб узварухнуць усе працоўныя масы на рэвалюцыйную барацьбу супраць фашысцкага ўрада — віноўніка голаду, вайны і беспрацоўя. Чым больш будзе масавае і рэвалюцыйнае выступленне, тым хутчэй працоўныя масы ўсвядомяць сабе, што атрымаць сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне яны могуць толькі зваліўшы фашысцкую дыктатуру, праз агульнае ўзброенае паўстанне”[16]. Адна з камуністычных перадвыбарчых лістовак так і называлася — „Ісьці масай да выбараў — з думкай аб узбройным паўстаньні!”[17]. Камуністамі рабіліся спробы стварэння мясцовых выбарчых камітэтаў у вёсках і мястэчках, на прадпрыемствах у гарадах. Улады, аднак, адразу правялі арышты іх асноўных актывістаў і анулявалі ўсе акруговыя спісы. Тым не менш, і пасля гэтага рабіліся спробы агітацыі за дэманстратыўнае галасаванне за ануляваныя спісы[18].

Незадоўга перад выбарамі, вясною 1930 г., адбылося датэрміновае вызваленне з турмы былых паслоў БСРГ Браніслава Тарашкевіча, Сымона Рак-Міхайлоўскага і Пятра Мятлы, а таксама іншых лідэраў партыі Фабіяна Акінчыца і Максіма Бурсевіча. Мяркуецца, што падобная акцыя была праведзеная польскімі ўладамі з разлікам на выступленне гэтых аўтарытэтных дзеячаў падчас будучай выбарчай кампаніі на баку памяркоўных беларускіх арганізацыяў і тым самым на аслабленне ўплываў камуністаў. Фабіян Акінчыц лічыў, што з усімі вызваленымі дзеячамі было дасягнута папярэдняе пагадненне аб іх лаяльнасці ў абмен на свабоду[19]. Ускосна пра гэта можа сведчыць тое, што яшчэ адзін зняволены грамадоўскі пасол, Павел Валошын, які ў траўні 1929 г. даслаў ліст да пасла БСРПК Ігната Дварчаніна з выказаннем гатоўнасці працягу ранейшай лініі[20], вызвалены ў той час не быў.

15 *Борьба трудящихся Западной Белоруссии за социальное и национальное освобождение и воссоединение с БССР*, т. 2 (1929-1939 гг.), Минск 1972, с. 105.

16 Там жа, с. 104.

17 Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей: НА РБ), ф. 242-п, воп. 1, спр. 10, а. 39-40.

18 В. А. Полуян, *Революционно-демократическое движение в Западной Белоруссии (1927-1939 гг.)*, Минск 1978, с. 188.

19 Ф. Акінчыц, *Правакацыя беларускага народу (да справы б. старшыні Грамады Б. Тарашкевіча)*, Вільня 1933, с. 17.

20 *Борьба трудящихся Западной Белоруссии за социальное и национальное освобождение и воссоединение с БССР*, т. 2, с. 19-20.

Аднак падзеі пайшлі зусім незапланавана. За падтрымку вызваленых былых грамадоўцаў адразу ж пачалося суперніцтва паміж беларускімі арганізацыямі розных накірункаў. Так, з адзначанымі дзеячамі правялі сустрэчы лідэры „Цэнтрасаюза" Антон Луцкевіч і Язэп Шнаркевіч, паслы-змаганцы Язэп Гаўрылік і Ігнат Дварчанін, адзін з кіраўнікоў Таварыства беларускай школы Фелікс Стэцкевіч[21]. Практычна нічога не вядома пра змест гэтых размоў, як і пра іншыя падрабязнасці закуліснай барацьбы за падтрымку былых грамадоўскіх лідэраў. Тарашкевіч у сваіх паказаннях НКВД згадваў пра сваю паездку ў Маскву прыблізна ў жніўні 1930 г., дзе сустракаўся з шэрагам камуністычных кіраўнікоў БССР[22]. Зноў жа невядома, пра што ішла гаворка падчас гэтых сустрэч, аднак пасля свайго вяртання ў Польшчу Тарашкевіч актыўна далучыўся да выбарчай кампаніі „Змагання", узначаліўшы яго выбарчы камітэт. Кіраваў ён выбарчай кампаніяй з тэрыторыі вольнага горада Гданьска, хоць фактычнае кіраўніцтва ажыццяўлялі мясцовыя актывісты КПЗБ — Юры Муха, Вацлаў Баярчук, Настасся Муха, Мікалай Марцінчык і інш.[23] За прыкладам Тарашкевіча пайшлі Рак-Міхайлоўскі, Мятла і Бурсевіч, якія рашыліся на выезд у БССР. Толькі Фабіян Акінчыц рэзка адмежаваўся ад камуністаў і далучыўся да „Цэнтрасаюза", узначаліўшы падчас выбараў яго кампанію.

Тарашкевіч і яго паплечнікі разгарнулі шырокую агітацыйную кампанію супраць палітычных канкурэнтаў. Былі выдадзены шэраг адозваў, у якіх іншыя беларускія арганізацыі паліваліся брудам. Пры гэтым пра верагоднасць інфармацыі і карэктнасць фармулёвак ніхто не клапаціўся. Так, пра „Цэнтрасаюз" у сваіх адозвах Тарашкевіч выказваўся так: „правакатары магутнай рабоча-сялянскай арганізацыі „Грамады"; пагромшчыкі ўсіх беларускіх культурна-прасветных арганізацыяў; узрыўшчыкі і падкопнікі пад ТБШ; платныя шпікі польскай дэфензівы, саджаючыя за турэмныя краты рэвалюцыйную моладзь; лёкаі польскай буржуазіі, фашызуючыя беларускія школы; разбойнікі, арганізуючыя бандыцкія напады на Беларускі сялянска-рабочы пасольскі клуб „Змаганьне"; грабары сацыяльна-нацыянальнага вызваленчага руху працоўных Заходняй Беларусі; агенты і памагатыя польскага фашызму, гатовячыя ваенны напад на бацькаўшчыну працоўных — БССР"[24].

21 AAN, Ministerstwo Spraw Wewnętrznych (далей: MSW) 1918-1939, sygn. 1031-dopływy, k. 50-51.

22 А. І. Валахановіч, У. М. Міхнюк, *Споведзь у надзеі застацца жывым*, Мінск 1996, с. 81-82.

23 AAN, MSW 1918-1939, sygn. 1202, k. 5-6.

24 НА РБ, ф. 242-п, воп. 1, адз. зах. 156, а. 107.

Трэба адзначыць, што падчас гэтых выбараў КПЗБ выступала адкрыта з агітацыяй за спіс Сялянска-рабочага адзінства, і з яе перадвыбарчых лістовак практычна зніклі нацыянальныя акцэнты. Прапаганда камуністаў мела выразную сацыяльна-класавую і інтэрнацыянальную накіраванасць. У іншай адозве таго ж Тарашкевіча адзначалася, што „хто хоча рашуча і ўпарта змагацца за: зямлю без выкупу працоўным сялянам і сельска-гаспадарчым работнікам, за сямігадзінны рабочы дзень, павелічэнне заработнай платы, за звальненне ад падаткаў работнікаў, сялянскай і гарадской беднаты і масаў серадняцтва, той, галасуючы за ўняважнены раб.-сялянскі спісак „Змаганне”, пойдзе пад сцяг інтэрнацыянальнага антыфашыстоўскага рабоча-сялянскага блоку, які вядзе безупынную барацьбу проці панавання капіталу і яго дыктатуры — за работніцка-сялянскі ўрад, які толькі і зможа даць і забяспечыць поўнае сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне працоўных”[25]. Праблемы чыста нацыянальныя, накшталт беларускай нацыянальнай адукацыі, як вынікае, у адозве наогул не закраналіся.

Гэта стала падставай для ацэнкі камуністаў з боку Беларускага нацыянальнага камітэта як „маючых няшмат агульнага з беларускай нацыянальнай справай”[26]. Таму на далучэнне радыкалаў да агульнага беларускага нацыянальнага выбарчага фронту ніхто не разлічваў, і перамовы пра гэта нават не вяліся. Згаданыя перамовы абмежаваліся ў выніку толькі размовамі паміж „Цэнтрасаюзам” і БХД з БСС. 2-4 кастрычніка ў Вільні адбыліся сустрэчы прадстаўнікоў „Цэнтрасаюза” Фабіяна Акінчыца і Вінцэнта Грышкевіча ды прадстаўнікоў БХД і БСС Янкі Пазняка і Фабіяна Ярэміча. Аднак лідэры „Цэнтрасаюза” імкнуліся да стварэння суменснага чыста беларускага выбарчага блока, а блок з украінцамі разглядаўся імі як дэманстратыўная палітычная акцыя. Таму лідэрам БХД і БСС было ўльтыматыўна запрапанавана разарваць з імі адносіны. Аднак апошнія не пагадзіліся на ліквідацыю раней заключанай дамовы[27]. Хутчэй за ўсё, сітуацыя вакол блока з украінцамі была толькі зачэпкай для зрыву перамоваў, сапраўднай жа яго прычынай была няздольнасць прыйсці да паразумення ў справе падзелу мандатаў.

Падчас выбараў 1930 года ўсе беларускія арганізацыі сутыкнуліся з вялікімі фінансавымі цяжкасцямі, чаму сярод іншага паспрыялі праведзеныя за некалькі месяцаў да таго выбарчыя кампаніі ў Лідскай і Свянцянскай акругах, у якіх беларусы бралі актыўны ўдзел

25 Ф. Акінчыц, *Правакацыя беларускага народу...*, с. 4.
26 M. Moroz, *„Krynica”. Ideologia i przywódcy białoruskiego katolicyzmu*, Białystok 2001, s. 188.
27 E. Wappa, *Okoliczności powstania Centralnego Związku...*, s. 69.

і патрацілі даволі значныя сродкі. У выніку толькі камуністы, якія атрымлівалі матэрыяльную дапамогу з СССР, маглі сабе дазволіць выдаць звыш 50 тысяч лістовак і адозваў, 130 тысяч лозунгаў і каля 100 тысяч розных карыкатур[28]. Астатнія арганізацыі мелі вельмі абмежаваныя крыніцы фінансавання, таму вымушаныя былі звяртацца да сваіх прыхільнікаў з просьбай працаваць выключна за ідэю. Хадэкі і сельсаюзнікі разлічвалі атрымаць пэўную матэрыяльную дапамогу ад саюзнікаў-украінцаў, аднак пасля пачатку пацыфікацыі ва Усходняй Галіччыне і арышту ўкраінскіх паслоў папярэдняга парламента гэтая справа спынілася[29].

Непасрэдна пасля роспуску парламента прэзідэнт Польшчы выдаў распараджэнне аб карах за выбарчыя злоўжыванні[30]. Гэта, аднак, быў толькі фармальны дакумент, выконваць які ніхто ад самага пачатку не збіраўся. Выбарчая кампанія 1930 г. была праведзена з нечуванымі парушэннямі з боку ўладаў. Амаль усе спісы, выстаўленыя беларускімі левымі арганізацыямі, быліануляваныя па фармальных прычынах. Быліануляваныя таксама спісы УБВК у Беластоцкай і Лідскай акругах. Астатнім партыям і арганізацыям рабіліся розныя перашкоды. У Палескім ваяводстве падчас выбараў у Сенат былі пакінутыя толькі 2 выбарчыя спісы: № 1 Беспартыйнага блока супрацоўніцтва з урадам (ББСУ) і № 17 Блока абароны правоў габрэйскай нацыянальнасці[31]. Праводзіліся арышты выбарчых актывістаў. Здараліся нават факты фізічнай ліквідацыі ўпаўнаважаных апазіцыйных спісаў, як гэта здарылася з упаўнаважаным камуністычнага спісу ў Брэсце[32].

Арганізатары выбарчай кампаніі ва ўсходніх ваяводствах нават не хавалі таго, што імі пры яе правядзенні былі зробленыя значныя злоўжыванні. Адзін з іх, Тадэвуш Галуўка, публічна заяўляў: „Аб’ектыўна мушу сказаць, што вельмі нам дапамог — вельмі яму за гэта ўдзячны — пасол Пужак, бо ён быў у галоўнай выбарчай камісіі, якая пры дапамозе графолага анулявала ўсе камуністычныя спісы ў колькасці, здаецца, шасці, сярод іх і спіс „Змаганьня” (...) Калі ж лакальныя камуністычныя спісы не дайшлі да акруговых выбарчых камісіяў, то гэта, на самой справе, сведчыць толькі пра

28 П. И. Зелинский, *Политическая работа Коммунистической партии Западной Белоруссии в массах, 1923-1938 гг.*, Минск 1986, с. 93.

29 CAW, Oddział II Sztabu Generalnego, sygn. I.303.4.2706, k. 19-20.

30 A. Ajnenkiel, *Historia Sejmu Polskiego*, t. II, cz. II, s. 156.

31 *Statystyka wyborów do Sejmu i Senatu z dnia 16 i 23 listopada 1930 roku,* „Statystyka Polski”, seria C, z. 4, Warszawa 1935, s. 127.

32 П. Корчык, *Вынікі фашыстоўскай выбарчай кампаніі ў Заходняй Беларусі*, „Бальшавік”,1931, № 1, с. 3.

тое, што наша адміністрацыя працуе належным чынам і на нашых ускраінах камунізм сёння не можа гаспадарыць так, як гаспадарыў перад гэтым”[33]. А. Айнэнкель пісаў: „У гісторыю ўвайшлі арганізаваныя там (на т.зв. „крэсах” — А. П.) у вёсках пасля набажэнстваў кур’ёзныя шэсці, на чале якіх знаходзіўся праваслаўны святар, а ў канцы паліцыянт. Яны згуртавана „дэманстратыўна” маршыравалі да выбарчых участкаў, дзе адкрыта ўкладвалі ў урны папярэдне атрыманыя нумаркі з «адзінкай»”[34]. У дачыненні да тых, хто супраціўляўся, прымянялася практыка штрафавання за розныя парушэнні, непасрэдна з выбарамі не звязанымі. Актывіст выбарнай кампаніі з Пінска дакладваў у справаздачы: „Паліцыя пачала (...) штрафаваць сялян за што папала. За багры па 25 злотых, за коміны, за брамы. (...) Калі не было да чаго прычапіцца, то за тое, што куры сядзелі пад печчу, а ў нас то ў кожнай гаспадарцы куры пад печчу. Падчас выбараў штрафы сыпаліся за тое, што дзіця адзін дзень да школы не пойдзе — па 10 злотых. (...) То ўсё за тое, што не галасавалі за № 1”[35]. Безумоўна, ва ўмовах невысокай грамадскай свядомасці і адпаведна малой ахвярнасці насельніцтва падобная практыка прыносіла пажаданы плён. Да таго ж уладамі праводзілася агітацыя супраць прынцыпу тайнасці галасавання і ўсе прыхільнікі маршала Пілсудскага заклікаліся галасаваць „адкрыта і дэманстратыўна”, так, каб укінуты ў урну нумар быў „добра бачны ўсім, хто знаходзіцца ў пакоі, а таксама сябрам Выбарчага камітэта”[36]. Зробленыя парушэнні законнасці сталі падставай для выслання Беларускім нацыянальным загранічным камітэтам 21 жніўня 1931 г. петыцыі ў Сакратарыят Лігі Нацый, у якой пералічваліся асноўныя віды парушэнняў[37].

Праўрадавы Беспартыйны блок супрацоўніцтва з урадам выступаў на выбарах, як і ў 1928 г., пад нумарам 1. Менавіта дзеля яго поспеху на выбарах былі прыкладзеныя ўсе намаганні мясцовай адміністрацыі. Прытым належыць адзначыць, што рэпрэсіі падчас выбараў прымяняліся не толькі супраць беларускіх арганізацыяў, але наогул супраць усёй апазіцыі да санацыйнага рэжыму. Сцвярджэнне аднаго з кіраўнікоў выбарчай кампаніі беларускіх камуністаў Г. Мухі-Мухноўскага, што „агенты Польскай сацыялі-

33 *Tadeusz Hołówko o demokracji, polityce i moralności życia publicznego*, wstęp, wybór i opracowanie A. Chojnowski, Warszawa 1999, s. 261.

34 A. Ajnenkiel, *Historia Sejmu Polskiego*, t. II, cz. II, s. 159.

35 НА РБ, ф. 242-п, воп. 1, адз. зах. 147, а. 150.

36 AAN, Ministerstwo Spraw Zagranicznych (далей: MSZ) 1918-1939, sygn. 2273, s. 64.

37 Там жа, k. 55-57.

стычнай партыі і партыі сялян „Вызваленне” (...) бесперашкодна перасоўваліся па ўсёй Заходняй Беларусі, агітуючы за сваіх кандыдатаў”[38], не адпавядае рэчаіснасці. Менавіта гэтыя левыя польскія партыі, аб'яднаныя ў блоку „Цэнтралеў”, Пілсудскі лічыў сваімі галоўнымі супернікамі на выбарах. Менавіта іх лідэры былі зняволеныя ў Брэсцкай крэпасці. А да актывістаў выбарчага спісу „Цэнтралева” прымяняліся не меншыя рэпрэсіі, чым да прадстаўнікоў нацыянальных меншасцяў: забараняліся іх мітынгі і сустрэчы з выбаршчыкамі, арыштоўваліся дзеячы, выяўляўшыя найбольшую актыўнасць, канфіскоўвалася і нішчылася перадвыбарчая літаратура[39].

Выбарчыя спісы ББСУ складаліся мясцовымі органамі ўлады і ўзгадняліся ваяводамі. Працягвалася практыка 1928 г. змяшчэння на іх прозвішчаў кандыдатаў з ліку мясцовых праваслаўных беларусаў „польскай культуры”. Часцей за ўсё гэтым асобам адводзілася чыста прадстаўнічая роля, і ставіліся яны на даволі далёкіх месцах. Так, праваслаўныя кандыдаты ў Наваградскай акрузе Генадзь Шыманоўскі і Павел Курусь атрымалі ў мясцовым спісе ББСУ толькі 4-е і 7-е месцы адпаведна (усяго з акругі выбіраліся 6 паслоў)[40]. Аднак сам факт прысутнасці такіх людзей у спісе і нават атрыманне некаторымі з іх пасольскіх мандатаў шырока выкарыстоўваўся ў прапагандысцкіх мэтах як унутры краіны, так і за яе межамі як паказчык дэмакратычнасці выбараў і забеспячэння магчымасці для нацыянальных меншасцяў мець сваіх прадстаўнікоў у парламенце[41].

Вынікі выбарчай кампаніі ў польскі парламент у 1930 годзе ў акругах з вялікай колькасцю беларускага насельніцтва былі практычна аднолькавыя: амаль усе пасольскія і сенатарскія мандаты атрымаў Беспартыйны блок супрацоўніцтва з урадам. Толькі ў Беластоцкім ваяводстве і ў Вільні некалькі мандатаў удалося атрымаць польскім правым партыям і Цэнтралеву. Вынікі беларускіх партый былі слабымі: у Наваградскай акрузе № 61 спіс Украінска-беларускага блока № 11 здабыў 1 789 галасоў, а спіс № 22 „Цэнтрасаюза” — 3 623 галасы. У Лідскай акрузе № 62 спіс № 22 атрымаў 3 487 галасоў. У Віленскай акрузе № 63 за Украінска-беларускі блок было пададзена 309 галасоў (з іх 132 — у Вільні), за „Цэнтрасаюз” — 21 голас (10 — у Вільні). У Свянцянскай акрузе № 64 галасы паміж

38 Г. М. Муха-Мухновский, *Пути-дороги*, Минск 1973, с. 171.

39 Z. Tomczonek, *Ruch ludowy na Kresach północno-wschodnich Drugiej Rzeczypospolitej*, Białystok 1996, s. 156-157.

40 G. Szymanowski, *Dwanaście lat — wspomnienia z lat 1927-1939*, Toruń 1998, s. 128.

41 AAN, MSZ 1918-1939, sygn. 2273, s. 69.

трыма выстаўленымі тут беларускімі спісамі размеркаваліся наступным чынам: Украінска-беларускі блок — 5 435 галасоў, „Цэнтрасаюз" — 5 249 галасоў, спіс Беларускіх незалежных радыкалаў — 1 997 галасоў. На выбарах у Сенат Украінска-беларускі блок набраў у Віленскім ваяводстве 1 775 галасоў і ў Наваградскім — 624 галасы, „Цэнтрасаюз" — 1 219 і 525 адпаведна[42]. Такая колькасць атрыманых галасоў выбаршчыкаў не дазваляла правесці ніводнага пасла ці сенатара. У выніку толькі лідэр Беларускага сялянскага саюза Фабіян Ярэміч атрымаў пасольскі мандат з дзяржаўнага спісу Украінска-беларускага блока. Беларускае парламенцкае прадстаўніцтва было практычна ліквідаванае, хоць са спісу ББСУ прайшлі яшчэ ў Сейм праваслаўныя паслы Генадзь Шыманоўскі (Наваградская акруга) і Васіль Куц (Лідская акруга), а таксама сенатар Васіль Сядун з Наваградскага ваяводства. Пасля забойства ў 1931 г. пасла ад Наваградскай акругі Тадэуша Галуўкі на яго месца ўвайшоў яшчэ адзін праўрадавы беларус Павел Курусь[43]. Ад нацыянальных спраў гэтыя парламентарыі, аднак, былі даволі далёкія і ў парламенце адыгрывалі хутчэй ролю звычайных статыстаў. Толькі Шыманоўскі праводзіў пэўную дзейнасць, скіраваную на абарону рэлігійных правоў праваслаўнага насельніцтва.

Улічваючы ўмовы правядзення выбараў, пры аналізе і ацэнцы іх вынікаў узнікаюць пэўныя цяжкасці. А. Айнэнкель лічыў, што, нягледзячы на ўсе парушэнні і фальсіфікацыі, падчас т.зв. „брэсцкіх" выбараў іх удзельнікі маглі зрабіць канкрэтны палітычны выбар. Доказам гэтага, на яго думку, з'яўляецца аддача 53,2% галасоў выбаршчыкаў па ўсёй Польшчы за праціўнікаў кіроўнага лагера[44]. Аднак непраўдападобна высокі працэнт прагаласаваўшых за ББСУ на тэрыторыі паўночна-ўсходніх выбарчых акруг дае падставы сумнявацца ў правамернасці падобных высноў прынамсі ў дачыненні да гэтых акруг.

Некаторыя польскія даследчыкі, аналізуючы вынікі гэтых выбараў, адзначалі, што вялікую ролю ў дасягненні перамогі ББСУ, акрамя шматлікіх фальсіфікацый, адыграў асабісты аўтарытэт сярод насельніцтва Юзэфа Пілсудскага: „Многія з тых, якія не прымалі палітыкі ўраду, якія не пагаджаліся з рэпрэсіямі, якія прызнавалі слушнымі аргументы апазіцыі, па-ранейшаму верылі ў Маршала. Быў для іх вялікім маральным аўтарытэтам, чалавекам, які ніколі не атрымліваў асабістых карысцяў з улады, якую ажыццяўляў, за-

42 *Statystyka wyborów do Sejmu i Senatu z dnia 16 i 23 listopada 1930 roku*, s. 116-119, 126-127.

43 G. Szymanowski, *Dwanaście lat...*, s. 178.

44 A. Ajnenkiel, *Historia Sejmu Polskiego*, t. II, cz. II, s. 161.

слугі якога ў атрыманні і ўмацаванні незалежнасці былі неаспрэчныя, у высакароднасць намераў якога верылася”[45]. Кандыдат-беларус са спісу ББСУ і будучы пасол Г. Шыманоўскі таксама сцвярджаў, што выбаршчыкі з Наваградчыны галасавалі за ББСУ, „бо гэта спіс маршала Пілсудскага, бо ён сам балатуецца ў Сейм на першым месцы гэтага спісу ў Варшаве”[46].

Падобныя сцвярджэнні можна лічыць справядлівымі для тэрыторыі цэнтральных ваяводстваў Польшчы, аднак у дачыненні да беларускага сялянства апеляцыя да аўтарытэту Пілсудскага некарэктная. Ад першых дзён устанаўлення польскай улады на беларускіх тэрыторыях у 1919 г. польскія цывільныя і вайсковыя ўлады праводзілі вельмі гвалтоўную палітыку ў дачыненні да беларускага насельніцтва. У выніку ў пазнейшай аналітычнай працы II Аддзела Генеральнага Штаба канстатавалася, што „пачатковы энтузіязм прыгасаў, пераходзіў у няпрыязнь, аж нарэшце зноў ператварыўся ў нянавісць да ўсяго польскага. Несумненна, той дысананс, які ўкраўся ў беларуска-польскія адносіны ў 1919-1920 гг., (...) з’яўляецца прычынай, што супрацьпольская агітацыя на тэрыторыях, прызнаных за Польшчай, і дзейнасць падрыўных арганізацыяў знайшла тысячы прыхільнікаў, і што антыпольскі настрой з’яўляецца адпаведна настроем большасці беларускага насельніцтва”[47]. Непрыязь да польскай дзяржавы азначала і непрыязь да яе стваральніка і ўмацавальніка, якім быў Пілсудскі. Пра адсутнасць вялікага аўтарытэту маршала сярод беларускіх сялян сведчаць і вынікі дастаткова дэмакратычных выбараў 1922 года, калі падтрымліваемы самім Пілсудскім і ўзначалены яго родным братам Янам спіс Дзяржаўнага аб’яднання на крэсах не атрымаў ніводнага пасольскага і толькі адзін сенатарскі мандат. У рэшце рэшт, рэзкі колькасны рост відавочна апазіцыйнай ў адносінах да польскіх уладаў Беларускай сялянска-работніцкай грамады (БСРГ) адбыўся пасля майскага дзяржаўнага перавароту, які ажыццявіў Пілсудскі ў 1926 г.

Перамога спісу ББСУ ў паўночна-ўсходніх выбарчых акругах на папярэдніх выбарах у 1928 г. таксама была ў значнай меры дасягнутая дзякуючы рэпрэсіям і фальсіфікацыям. Гэта прызнаў нават польскі Вярхоўны суд,ануляваўшы ў 1930 г. вынікі выбараў у Лідскай і Свянцянскай акругах. Пры паўторных выбарах у маі і ліпені 1930 г., пры адсутнасці спісаў ББСУ, у гэтых акругах здабылі мандаты, відавочна апазіцыйна настроеныя ў адносінах да

45 A. Garlicki, *Od Brześcia do maja*, Warszawa 1986, s. 77.
46 G. Szymanowski, *Dwanaście lat...*, s. 129.
47 *Krótki zarys zagadnienia białoruskiego*, Warszawa 1928, s. 88.

ўлады, БСРПК „Змаганьне”, Стронніцтво Хлопске і Блок нацыянальных меншасцяў.

Патрэбна яшчэ дадаць, што выбары 1930 г. адбываліся ва ўмовах цяжкага эканамічнага крызісу, які закрануў усе галіны гаспадаркі. Так, за перыяд з 1928 да 1930 гг. кошт жыта знізіўся на 52,3%, бульбы — на 52,6%, малака — на 19,7%, буйной рагатай жывёлы — на 14,7%, свіней — на 7,3%[48]. Прыбыткі сялянскіх гаспадарак да 60 га (а менавіта такіх была большасць у Заходняй Беларусі) у чатырох паўночна-ўсходніх ваяводствах Польшчы за гэты перыяд зніізіліся амаль на 40%[49]. Вельмі сумнеўна, каб пры такіх умовах маглі масава змяняцца ў лепшы бок негатыўныя і да крызісу адносіны да дзяржаўнага кіраўніцтва.

Пэўная доля праўды ёсць у словах Станіслава Элскага, які сцвярджаў, што „выбары ў Сейм і Сенат несумненна паказваюць, што шырокія масы крэсовага насельніцтва паверылі ў рэальнасць польскай дзяржаўнасці і зразумелі, што да дабрабыту і спакою вядзе ніякі іншы шлях, як менавіта той, які паказвае дзяржаўная польская думка”[50]. Пры выбарах у 1922 г. і нават у 1928 г. у насельніцтва сапраўды існавалі настроі, што польская дзяржаўнасць на т.зв. „усходніх крэсах” нетрывалая і непазбежная хуткая змена дзяржаўных межаў. Такія настроі актыўна падсычалі камуністычныя агітатары, а ў 1922 г. у значнай ступені і агітатары Блока нацыянальных меншасцяў. У 1930 годзе трываласць польскай дзяржаўнасці ўжо мала падвяргалася сумненню, а падзеі ў БССР (расправа над нацыянальнымі дзеячамі, пачатак калектывізацыі), безумоўна, паспрыялі пэўнаму аслабленню ў масах прасавецкіх сімпатыяў. Гэтая тэндэнцыя ў пэўнай ступені закранула і нацыянальных дзеячаў, якія дагэтуль у той ці іншай меры супрацоўнічалі з Беларускім сялянска-рабочым пасольскім клубам. Некаторая іх частка перайшла на нацыянальныя пазіцыі і далучылася да іншых беларускіх арганізацяў. Так, на спісах „Цэнтрасаюза” апынуліся былыя прыхільнікі БСРПК Кузьма Крук і Іван Малец[51]. Ёсць і пэўныя звесткі аб імкненні навязаць кантакты з мясцовымі нацыянальнымі дзеячамі з боку Беластоцкага акруговага камітэта КПЗБ[52].

Праведзеныя рэпрэсіі і фальсіфікацыі не даюць магчымасці аца-

48 Z. Landau, J. Tomaszewski, *Zarys historii gospodarczej Polski 1918-1939*, Warszawa 1999, s. 189.

49 И. В. Полуян, *Западная Белоруссия в период экономического кризиса 1929-1933 гг.*, Минск 1991, с. 54.

50 S. Ełski, *Sprawa białoruska: zarys historyczno-polityczny*, Warszawa 1931, s. 74.

51 AAN, MSW 1918-1939, sygn. 1081-dopływy, k. 50-52.

52 П. Корчык, *Вынікі фашыстоўскай выбарчай кампаніі...*, с. 9.

ніць сапраўдны памер уплываў беларускіх арганізацыяў сярод насельніцтва Заходняй Беларусі. Пэўныя высновы, аднак зрабіць можна. Так, бясспрэчна пацвердзілася недастатковая палітычная спеласць і актыўнасць беларускага сялянства, яго пасіўнасць і абыякавасць. Гэтыя фактары дазволілі ўладам дасягнуць настолькі добрых для сябе вынікаў. Да таго ж вялікую ролю адыгралі зусім сціплыя практычныя дасягненні беларускіх паслоў у парламентах папярэдніх двух скліканняў, што спрычынілася да агульнага расчаравання ў эфектыўнасці парламенцкіх метадаў барацьбы. Вінцэнт Мядзёлка, бацька беларускай дзяячкі Паўліны Мядзёлкі, які жыў у той час у в. Буды ў Пастаўскім павеце (Свянцянская выбарчая акруга), занатаваў у сваім дзённіку: „Галасавалі зусім мала з прычыны пагоды, а найбольш тое, што ў народа паўстала апатыя да ўсяго палітычнага з прычыны тэрору з боку ўраду, папоў, асаднікаў, (...) людзі страцілі давер у галасаванне, а хто і галасаваў, то за № 1, Пілсудскага, здаліся на яго ласку і будуць глядзець, што ён зробіць”[53].

Пра тое, што пры большай нацыянальнай кансалідацыі вынікі выбараў маглі б быць зусім іншымі, сведчыць прыклад Заходняй Украіны. Украінцы ўдзельнічалі ў выбарах у найскладанейшай сітуацыі, калі на ўсёй тэрыторыі Усходняй Галіцыі польскімі ўладамі праводзілася жорсткая пацыфікацыя. Практычна ўсе лідэры былі арыштаваныя, ціск на насельніцтва быў непараўнальна большы, чым у Заходняй Беларусі. Такая сітуацыя, аднак, толькі яшчэ больш згуртавала заходнеўкраінскую грамадскасць. Упершыню з 1922 года ўсе нацыянальныя партыі аб’ядналіся, а насельніцтва, нягледзячы на рэпрэсіі, у значнай сваёй частцы галасавала за сваіх. У выніку спіс № 11 атрымаў ва Усходняй Галіцыі 30,8% галасоў, а на Валыні — 12,6%. Былі праведзеныя 21 пасол (адзін з іх — беларус Ф. Ярэміч, прайшоўшы па дзяржаўнаму спісу) і 4 сенатары[54].

У Заходняй Беларусі ход падзеяў пайшоў па зусім іншаму сцэнарыю. Беларускія нацыянальныя дзеячы не здолелі пераступіць праз асабістыя амбіцыі і пайшлі на выбары асобнымі групамі, тры з якіх — „Цэнтрасаюз”, БХД-БСС і група Стаповіча-Юхневіча практычна не мелі сур’ёзных праграмных адрозненняў. Асабістыя інтарэсы партыйных лідэраў былі пастаўленыя вышэй за грамадскія, і такім чынам адбылося разбіццё і без таго не вельмі вялікіх нацыяналь-

53 Т. Лянкевіч, *Хатні каляндар В. С. Мядзёлкі*, [у:] *Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Мядзельскага раёна*, Мінск 1998, с. 149.

54 О. Ю. Зайцев, *Представники українських політичних партій Західної України в парламенті Польщі (1922-1939 рр.)*, „Український історичний журнал”, 1993, № 1, с. 75-76.

ных сілаў, што прадвызначыла поўны правал на выбарах. З дадзенай сітуацыі можна зрабіць выснову аб незавершанасці працэсу фармавання беларускай нацыянальнай эліты, што стала адной з галоўных прычынаў наступных несумненных поспехаў польскай дзяржаўнай палітыкі 30-х гадоў, накіраванай на нацыянальную асіміляцыю беларусаў і знішчэнне беларускага нацыянальнага руху.

З афіцыйных вынікаў выбараў можна, аднак, зрабіць і такую выснову, што намаганні беларускіх дзеячаў па нацыянальнаму ўсведаменню насельніцтва не прайшлі зусім дарма. І „Цэнтрасаюз", і Украінска-беларускі блок, і спіс Беларускіх незалежных радыкалаў ішлі на выбары з выразна нацыянальнымі лозунгамі, і за іх усіх агулам на выбарах у Сейм былі аддадзеныя 21 910 галасоў. Улічваючы, што гэтым разам не заключаўся выбарчы саюз з габрэямі і дэманстратыўна асобна ішлі камуністы з іх інтэрнацыянальнай ідэалогіяй, гэтых людзей можна лічыць прыхільнікамі беларускай нацыянальнай ідэі. Прытым прыхільнікамі дастаткова перакананымі, таму што ва ўмовах ціску, рэпрэсіяў і непрыхаванага прасоўвання кандыдатаў урадавага блока аддача голасу за іншы спіс наўрад ці магла адбывацца выпадкова і несвядома.

Колькасць прагаласаваўшых за беларускія спісы, безумоўна, складала невялікую долю ў агульнай колькасці выбаршчыкаў у Віленскім і Наваградскім ваяводствах, дзе былі выстаўленыя беларускія спісы — усяго 3,25%. Аднак гэтая лічба адлюстроўвае толькі мінімальны парог уплываў беларускіх арганізацыяў. Пры ўмове дэмакратычных выбараў яна была б, несумненна, большай. Тым не менш, варта адзначыць як пазітыў ужо той факт, што беларускі нацыянальны рух у канцы 20-х — пачатку 30-х гадоў ужо меў пэўнае кола сваіх **перакананых** прыхільнікаў, і іх колькасць налічвала ўжо не некалькі дзесяткаў ці соцень чалавек, як яшчэ за 15-20 гадоў да гэтага, а дасягнула дзесяткаў тысяч толькі ў заходняй частцы Беларусі.

Выбары 1930 г. былі апошнімі выбарамі ў міжваеннай Польшчы, у якіх прымалі ўдзел беларускія нацыянальныя арганізацыі. Наступныя выбары ў 1935 г. праходзілі ўжо паводле новага выбарчага закона, які канчаткова ператвараў іх у фармальнасць. Таму ўсе беларускія групы прынялі рашэнне аб іх байкоце. Сітуацыя паўтарылася і ў 1938 г. Такім чынам, выбары 1930 г. сталі апошняй магчымасцю для беларусаў праверыць свае сілы ў выбарчай барацьбе і засведчылі паглыбленне крызісу ў беларускім нацыянальным руху, які цягнуўся ад разгрому Беларускай сялянска-работніцкай грамады ў пачатку 1927 г. і які не ўдалося пераадолець да самага канца існавання ІІ Рэчы Паспалітай.

**Streszczenie**

30 sierpnia 1930 r. dekretem prezydenta został rozwiązany parlament Polski. Towarzyszyły temu aresztowania posłów opozycji, w tym białoruskich — Jazepa Hawrylika, Flegonta Wołyńca, Pawła Kryńczyka i Ignacego Dworczanina. Nowe wybory ogłoszono na 16 i 23 listopada, lecz nie było żadnych warunków, aby mogły one odbyć się zgodnie z demokratycznymi zasadami. W ruchu białoruskim w tym czasie istniały trzy nurty. Pierwszy, skupiony wokół Białoruskiego Chłopsko-Robotniczego Klubu Poselskiego, reprezentował orientację komunistyczną. Jego przywódcy zostali aresztowani po rozwiązaniu parlamentu. Drugi nurt reprezentowany był przez Białoruską Chrześcijańską Demokrację, Białoruski Związek Chłopski i Białoruskie Prawosławne Zjednoczenie Demokratyczne. Partie te 9 września utworzyły Ogólnobiałoruski Komitet Wyborczy z hasłami zmniejszenia podatków, szkoły z językiem ojczystym, równego traktowania obywateli bez względu na narodowość i wyznanie. Trzeci nurt reprezentował nowo utworzony Centralny Związek Białoruskich Organizacji i Instytucji Kulturalno-Oświatowych (Centrasajuz). Deklarował on ograniczenie aktywności do pracy kulturalno-oświatowej i działalność jedynie w ramach obowiązującego prawa państwowego. Chadecy doszli do porozumienia z Ukraińcami i utworzyli wspólny Ukraińsko-Białoruski Blok Wyborczy. Brak środków na prowadzenie kampanii wyborczej oraz rozłamy w Białoruskim Komitecie Wyborczym osłabiały jego szanse w wyborach. Komitet faktycznie nie prowadził żadnej akcji w województwach białostockim i poleskim. Zwolennicy nurtu komunistycznego w trakcie kampanii prowadzonej na wszystkich ziemiach zamieszkałych przez Białorusinów nawoływali do walki nie tylko z sanacją, lecz także z białoruskimi organizacjami narodowymi. Bardzo negatywną kampanię propagandową przeciwko Białoruskiemu Komitetowi Wyborczemu i Centrasajuzowi prowadzili zwolnieni z więzienia przywódcy Hromady. Dochodził do tego konflikt między dwoma nurtami narodowymi. W tej atmosferze wybory zakończyły się całkowitą klęską organizacji białoruskich. Do sejmu wszedł jedynie przywódca Białoruskiego Związku Chłopskiego Fabian Jeremicz.